*Д. С. Рубан*

# ФУНКЦЫІ ВУЧЭБНАЙ КНІГІ ДЛЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

Нягледзячы на імклівае развіццё электронна-вылічальнай і аўдыявізуальнай тэхнікі, шырокае ўкараненне камп'ютарных тэхналогій і «экраннай культуры» ў сістэму адукацыі, асноўнай крыніцай і важнейшым сродкам навучання застаецца вучэбная кніга. Пры гэтым развіццё сістэмы сродкаў навучання вядзе за сабой змяненне функцый вучэбнай кнігі: па-першае – пераразмеркаванне гэтых функцый у складзе сістэмы, па-другое – з'яўленне новых функцый у цэласнай сістэме інфармацыйна-дыдактычных сродкаў.

Аналіз навуковай літаратуры, матэрыялаў дысертацыйных даследаванняў, артыкулаў перыядычнага друку, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў дае аснову зрабіць вывад, што на сёння ў Рэспубліцы Беларусь пытанні тэорыі вучэбнай кнігі наогул і для вышэйшай школы, у прыватнасці, асветлены вельмі мала. Пытанні тэорыі вучэбнай кнігі зводзяцца да вывучэння асобных відаў выданняў, часцей за ўсё – падручніка. Сустракаюцца работы па праблемах падрыхтоўкі пэўных відаў вучэбнай кнігі (Н. І. Тупальскі). Разрозненыя звесткі па дадзенай праблеме, матэрыялы прыкладнога характару змешчаны ў навуковых працах па кнігазнаўстве, тыпалогіі кнігі, цалкам кніжнай справе.

У дадзеным артыкуле мы спрабуем, выкарыстоўваючы аналітычны метад, вызначыць функцыі вучэбнай кнігі для вышэйшай школы і падставы сістэматызацыі гэтых функцый.

У тэорыі падручніка сукупнасць функцый часцей называюць комплексам або сістэмай педагагічных функцый (Д. Д. Зуеў, У. Г. Бейлінсан, І. Я. Лернер). Наяўнасць сістэмы прадугледжвае выяўленне сістэмаўтваральнага фактару, які павінен быць адзінай падставай для класіфікацыі функцый, вызначэння іх узаемасувязі. Аднак да цяперашняга часу асноўныя прынцыпы, адзіныя падставы класіфікацыі і сістэматызацыі функцый даследчыкамі не выяўлены. І як вынік, функцыі, якія выдзелены ў тэорыі падручніка, недастаткова строга выстройваюцца ў сістэму, складваецца ўражанне іх эклектычнасці і незавершанасці, назіраюцца разнастайнасць і няўзгодненасць аўтарскіх падыходаў пры вызначэнні колькасці функцый і іх наймення [6].

Выяўляючы падставы сістэматызацыі функцый вучэбнай кнігі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для вышэйшай школы, мы зыходзім з наступных палажэнняў:

– па-першае, вучэбная кніга з’яўляецца неабходным элементам структуры вышэйшага парадку, часткай цэлага. У цэласнай сістэме часткі выражаюць прыроду цэлага і набываюць спецыфічныя для яго ўласцівасці. Можна зрабіць выснову, што канстытуцыйныя функцыі (сутнасныя, асноватворныя), якія рэалізуюцца часткай, павінны адпавядаць канстытуцыйным функцыям цэлага;

– па-другое, функцыя – гэта адносіны двух (груп) аб’ектаў, у якіх змяненню аднаго з іх садзейнічае змяненне другога [7, с.1173]. Гэта дазваляе вызначыць абумоўленасць змены вучэбнай кнігі і яе функцый адносна патрабаванняў сістэмы адукацыі.

Канстытуцыйнымі функцыямі вышэйшай адукацыі з’яўляюцца адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая [4, с.23–28]. Пры гэтым навукоўцы прызнаюць адноснасць раздзялення гэтых функцый, непарыўную сувязь іх адна з адной, аднак і вызначаюць іх пэўную спецыфіку.

Згодна з палажэннем аб узаемасувязі цэлага (працэсу адукацыі і яго функцый) і часткі (вучэбнай кнігі і яе функцый), можна сцвярджаць, што асноўнае прызначэнне вучэбнай кнігі для вышэйшай школы – рэалізацыя адукацыйнай, развіццёвай і выхаваўчай функцый.

У. У. Краеўскі, І. Я. Лернер, У. П. Бяспалька, У. І. Смірноў вызначаюць таксама тэхналагічную функцыю [1; 3; 5]. Тэхналагічная функцыя арыентавана не толькі на метадычнае забеспячэнне вучэбнай дзейнасці, але і на арганізацыю матэрыялу самой вучэбнай кнігі.

Выдзяляюцца і службовыя функцыі, якія носяць падпарадкавальны характар і арыентаваны на рэалізацыю састаўных мэт адукацыі.

Вызначым асноўныя характарыстыкі канстытуцыйных (унутраных) і службовых (знешніх) функцый вучэбнай кнігі.

***Адукацыйная функцыя*** арыентавана на фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў, поглядаў, перакананняў, а таксама пэўны ўзровень пазнавальных здольнасцей і практычнай падрыхтоўкі. Службовымі адносна адукацыйнай з’яўляюцца функцыі:

– *інфармацыйная* – накіравана на развіццё інфармацыйнай культуры будучага спецыяліста. Вучэбная кніга для вышэйшай школы з’яўляецца асноўнай крыніцай засваення вучэбна-навуковай інфармацыі;

– *арыентацыйная* – забяспечвае пастаноўку мэт і задач

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэння дысцыпліны і канкрэтнага вучэбнага матэрыялу;

– *даследчая* – рэалізуецца праз апісанне шляхоў і метадаў пазнання;

– *сістэмнасці* – забяспечвае поўнае, цэласнае засваенне вучэбнага матэрыялу;

– *інтэрпрэтацыйная* – вучэбная кніга не толькі прадстаўляе вучэбна-навуковую інфармацыю, але і тлумачыць яе;

– *камунікатыўная* – выступае як форма зносін, перадачы інфармацыі аб каштоўнасцях жыцця, агульных маральных каштоўнасцях.

***Развіццёвая функцыя*** вучэбнай кнігі садзейнічае развіццю мыслення, памяці, мовы, увагі, дазваляе падняцца на новыя ступені інтэлектуальнага і асабістага развіцця. Да ліку службовых функцый мы аднеслі:

– *функцыю самаадукацыі;* вучэбная кніга, выкарыстоўваючыся ў працэсе самаадукацыі, арыентуе будучага спецыяліста на паглыбленне і пашырэнне ведаў, фарміруе патрэбнасць у самаадукацыі. У працэсе самастойнай работы з вучэбнай кнігай будучы спецыяліст набывае навыкі, якія яму спатрэбяцца, калі ён сутыкнецца з манаграфічнай літаратурай, навуковай перыёдыкай;

– *пазнавальную функцыю,* якая дае магчымасць пазнання прыроды, грамадства і чалавека, рацыянальна-тэарэтычных дасягненняў свету, адкрыцця яго законаў і заканамернасцей, тлумачэння розных з’яў і працэсаў, здзяйснення прагнастычнай дзейнасці, стварэння новых ведаў.

***Выхаваўчая функцыя*** вучэбнай кнігі для вышэйшай школы накіравана на фарміраванне навуковых уяўленняў аб свеце і самім сабе, што садзейнічае развіццю пэўных якасцей і ўласцівасцей асобы, яе светапогляду. Выхаванне творчай асобы – адна з галоўных задач вышэйшай школы. ВНУ імкнецца сфарміраваць у маладога спецыяліста навуковы светапогляд, садзейнічаць выпрацоўцы такіх метадалагічных навыкаў, якія дазволяць яму ў будучым папаўняць і абнаўляць свае веды, а таксама працаваць ва ўмовах недастатковай інфармацыі [2, с.16]. Службовымі ў адносінах гэтай функцыі з’яўляюцца:

– *светапоглядная* – вучэбная кніга змяшчае пэўную сістэму поглядаў аб свеце, з’явах прыроды і грамадства, заканамернасцях іх існавання і развіцця. Гэтая функцыя арыентавана на распрацоўку навуковага светапогляду і навуковай карціны свету, абгрунтаванне навуковага светаразумення;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *каштоўнасна-арыентаваная* – выпрацоўвае сістэму перавагі адных каштоўнасцей перад другімі, дазваляе выявіць найбольш правільныя ацэнкі і лінію паводзін, арыентуе асобу ў свеце культурных каштоўнасцей.

***Тэхналагічная функцыя***, як адзначалася вышэй, арыентавана не толькі на метадычнае забеспячэнне вучэбнай дзейнасці, але і на арганізацыю матэрыялу самой вучэбнай кнігі. Службовымі з'яўляюцца:

1) функцыі, якія забяспечваюць арганізацыю працэсу адукацыі:

– *праектыўна-метадычная* – вучэбная кніга выступае як своеасаблівы праект, сцэнарый працэсу навучання, змяшчае метадычныя рэкамендацыі, з улікам якіх выкладчык можа праектаваць і ажыццяўляць працэс навучання;

– *арганізацыйна-метадычная* – вучэбная кніга дае прадстаўленне аб арганізацыйных формах, метадах і сродках навучання;

– *кантролю* – вучэбная кніга ўключае комплекс пытанняў і заданняў, выкананне якіх дазваляе праверыць і ацаніць якасць вучэбнай працы;

– *замацавання* – засваенню ведаў садзейнічаюць уключаныя ў вучэбную кнігу заданні і практыкаванні;

2) функцыі, якія забяспечваюць арганізацыю вучэбнага матэрыялу:

– *нарматыўна-змястоўная* – у вучэбнай кнізе змяшчаецца матэрыял, які прадугледжаны дзяржаўнымі стандартамі, вучэбнымі планамі і праграмамі;

– *структурна-змястоўная* – у дыдактыцы прадстаўлены розныя тэарэтычныя падыходы пошуку аптымальнай структуры вучэбнай кнігі, выяўлены набор гэтых элементаў (главы, параграфы, раздзелы, заданні, пытанні, практыкаванні, прадмова, заключэнне, змест і інш.), якія дазваляюць стварыць цэласнасць канструкцыі вучэбнай кнігі;

– *сістэматызацыі* – вучэбная кніга павінна забяспечваць строгую, паслядоўную сістэматызацыю ўсіх матэрыялаў, якія складаюць змест навучання па пэўнай дысцыпліне;

– *трансфармацыйная* – рэалізуе перапрацоўку навуковых ведаў у вучэбны матэрыял, што садзейнічае максімальнаму засваенню інфармацыі і яе сістэматызацыі;

– *інтэграцыі* – вучэбная кніга павінна забяспечваць рэалізацыю адукацыйнай, развіццёвай, выхаваўчай функцый;

– *сінтэзу* – вучэбная кніга на аснове сінтэзу адукацыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, высноў і абагульненняў з розных галін навуковых ведаў, вопыту пазнавальнай дзейнасці прызвана садзейнічаць гарманізацыі ўяўленняў асобы аб навакольным свеце і сабе і развіццю цэласнага светаўспрымання.

Вызначэнне функцый вучэбнай кнігі звязана з яе мэтавым прызначэннем і характарам інфармацыі, узроўнем удзелу ў рэалізацыі патрэб навучання тых, хто навучаецца і навучае. Неабходна адзначыць, што кожны від выдання мае свае дамінуючыя функцыі, што вызначае іх ролю і месца ў працэсе навучання. Напрыклад, для падручніка, вучэбнага дапаможніка дамінуе пазнавальная функцыя, для зборнікаў задач і практыкаванняў – функцыя замацавання і кантролю, для практыкумаў – арганізацыйна-метадычная.

---


1. *Беспалько, В. П.* Теория учебника: дидактический аспект. – М.: Педагогика, 1988. – 160 с. – (ОПН: Образование. Педагогические науки. Дидактика).

2. *Долженко, О.* Учебник для вуза: каким ему быть? / О. Долженко // В мире книг. – 1980. – № 1. – С. 16–18.

3. *Краевский, В. В.* Определение функций учебника как методологическая проблема дидактики // Проблемы школьного учебника. Вып.4. – М., 1976. – С. 11–19.

4. *Лачугина, Ю. Н.* Психология и педагогика: учеб. пособие: в 2 ч. / Ю. Н. Лачугина. – Ульяновск: УлГТУ, 2008. – Ч. 2: Педагогика. – 52 с.

5. *Лернер И. Я.* О дидактических основаниях построения учебника // Проблемы школьного учебника. Вып. 20. – М.: Просвещение, 1991. – С. 23–31.

6. *Смирнов, В. И.* Учебная книга: характеристика основных дефиниций и функций / В. И. Смирнов. – Режим доступа: library.ntspi.ru/txt/ Смирнов-учебная% 20книга.doc. – Дата доступа: 12.08.2010.

7. *Всемирная* энциклопедия. Философия / гл. науч. ред. и сост. А. А. Грицанов. – М.: АСТ; Минск: Харвест; Современный литератор, 2001. – 1312 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ